# Паход ваяводы А. Трубяцкога лета – восені 1655 г. у Вялікае Княства Літоўскае і знішчэнне Клецка

**П. Л. Дзям'ян,**
аспірант кафедры
гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі,
Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы

*«Государев поход» лета – восені 1655 г. быў другім вялікім наступленнем маскоўскага войска ў Вялікім Княстве Літоўскім (ВКЛ), які адносіцца да першага этапу вайны 1654–1667 гг. Вайна паміж Маскоўскай дзяржавай і Рэччу Паспалітай пачалася вясной 1654 г. Баявыя дзеянні прывялі да істотных тэрытарыяльных страт з боку ВКЛ. Царскае войска заняло Полацкае, Віцебскае, Мсціслаўскае ваяводствы, а запарожскія казакі кантралявалі Рэчыцкі і Мазырскі паветы Мінскага ваяводства. Зімой 1654–1655 гг. войска ВКЛ пры дапамозе каронных сіл спрабавала правесці контрнаступленне, у выніку якога былі заняты падняпроўскія гарады Орша, Дуброўна, Шклоў. Тым не менш зімовая аблога Магілёва завяршылася для войска ВКЛ беспаспяхова. Спробы перахапіць ініцыятыву праваліліся. У той жа час у Маскоўскай дзяржаве актыўна вяліся падрыхтоўчыя работы да новага наступлення летам 1655 г.*

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 28.02.2023.

У гістарыяграфіі баявыя дзеянні лета – восені 1655 г. знайшлі адлюстраванне ў работах расійскіх, беларускіх і польскіх даследчыкаў. Першым, хто звярнуў увагу на дадзеную тэматыку, быў расійскі савецкі гісторык А. Мальцаў [1]. У яго грунтоўнай рабоце асобная глава прысвечана падзеям лета – восені 1655 г. на тэрыторыі ВКЛ. У межах гэтай главы разглядаецца і баявы шлях войскаў ваяводы Аляксея Трубяцкога ў Наваградскім ваяводстве. У беларускай гістарыяграфіі баявыя дзеянні лета – восені 1655 г. на Наваградчыне апісаў у сваім артыкуле В. Мялешка [2]. Гэтую ж тэму разглядаў у сваёй кнізе Г. Сагановіч [3]. Сярод польскіх даследчыкаў, якія вывучалі баявыя дзеянні ў акрэслены перыяд, вылучаецца артыкул М. Савіцкага [4]. Ён апісаў аблогу Слуцка маскоўскімі войскамі ў верасні 1655 г. Становішча Слуцка ў перыяд вайны 1654–1667 гг. даследаваў у асобным артыкуле польскі гісторык К. Касажэцкі [5].

Вялікае значэнне таксама маюць працы, прысвечаныя развіццю асобных уладанняў і маёнткаў князёў Радзівілаў на Наваградчыне: публікацыі М. Волкава, А. Грыцкевіча і В. Пазднякова. У рабоце М. Волкава закранаюцца пытанні развіцця абарончых збудаванняў прыватных гарадоў у ВКЛ на працягу XVII ст., у тым ліку Слуцка і Клецка [6]. Манаграфіі А. Грыцкевіча і В. Пазднякова прысвечаны разгляду сацыяльна-эканамічнага развіцця Слуцка і Клецка ў XVI–XVIII стст. [7; 8].

Пакладзеныя ў аснову нашага даследавання крыніцы можна падзяліць на справаводныя, актавыя і гаспадарчыя. Да першай групы адносяцца матэрыялы справаводства Маскоўскай дзяржавы – царская грамата да жыхароў Слуцка з прапановай здаць горад і справаздачы «отписки» ваяводы Аляксея Трубяцкога на царскае імя. Гэтыя дакументы ўтрымліваюць вельмі каштоўныя звесткі пра ход баявых дзеянняў на тэрыторыі Наваградскага ваяводства восенню 1655 г. [9; 10]. Крыніцы з тэрыторыі ВКЛ прадстаўлены матэрыяламі прыватнага архіва князёў Радзівілаў. Асноўную групу складаюць актавыя і гаспадарчыя дакументы. Сярод іх можна адзначыць, напрыклад, ліст князя Багуслава Радзівіла капыльскаму мешчаніну на зямельныя ўладанні, які ўтрымлівае згадкі пра спусташэнні ў выніку дзеянняў маскоўскага войска [11]. Вельмі каштоўныя звесткі прадстаўляе «Wieryfikacja ludu w księstwie Kleckim wyciętego i wybranego przez Moskwę»[1]. Гэта падрабязная рэвізія Клецкага княства, складзеная вясной 1656 г. Яна ўтрымлівае дакладны пералік разбурэнняў і страт сярод мясцовых жыхароў у выніку баявых дзеянняў восені 1655 г. Дадзеныя крыніцы дазваляюць дэталёва апісаць ход баявых дзеянняў на тэрыторыі

[1] Аўтар выказвае шчырую падзяку польскаму даследчыку Кшыштафу Касажэцкаму за магчымасць азнаёміцца з тэкстам справы падчас работы над тэкстам артыкула.

Наваградскага ваяводства і праілюстраваць іх наступствы на прыкладзе Клецкага княства [12].

Паход ваяводы А. Трубяцкога на тэрыторыю Наваградскага ваяводства восенню 1655 г. быў адлюстраваны ў работах папярэдніх даследчыкаў у кантэксце «государева похода» 1655 г., пры гэтым у межах асобных даследаванняў дадзеная тэма не разглядалася. Важнае значэнне маюць крыніцы, раней не ўведзеныя ў навуковы зварот. Іх выкарыстанне дазволіць больш дэталёва апісаць падзеі на Наваградчыне восенню 1655 г.

Асноўная мэта летняй кампаніі 1655 г. на тэрыторыі ВКЛ для Маскоўскай дзяржавы – ліквідацыя вынікаў зімовага контрнаступлення войскаў ВКЛ, пасля чаго прадугледжвалася заняць усю тэрыторыю ВКЛ. Як і годам раней, асноўныя сілы маскоўскага войска былі падзелены на тры часткі – паўночную, цэнтральную і паўднёва-заходнюю. Кожная павінна была наступаць у загадзя акрэсленым напрамку. Задача паўночнай групы – заняць Веліж і зняць небяспеку, якая сыходзіла ад войскаў ВКЛ у Віцебску, Полацку і іншых гарадах Падзвіння. Пасля гэтага яна павінна была наступаць у глыб тэрыторый ВКЛ. Задача цэнтральнай арміі – наступаць на Мінск, а пасля рухацца ў бок сталіцы ВКЛ – Вільні. Паўднёва-заходняя група павінна была ўзяць Стары Быхаў, які працяглы час трымалі ў аблозе запарожскія казакі, а пасля гэтага працягнуць наступленне па маршруце Слуцк – Наваградак – Берасце. Кіраванне гэтай часткай царскага войска было ўскладзена на ваяводу А. Трубяцкога. Такім чынам, пры ўмове паспяховых дзеянняў усіх частак маскоўскага войска ўся тэрыторыя ВКЛ павінна была апынуцца пад кантролем Масквы [1, с. 78–79].

Камандаванне ставіла для паўднёва-заходняй арміі задачу выступіць у паход у маі разам з іншымі войскамі. Падрыхтоўка войска да будучых аперацый ішла ў Бранску. Менавіта туды ў пачатку сакавіка 1655 г. прыбыў ваявода А. Трубяцкі. Пасля завяршэння падрыхтоўчых мерапрыемстваў у пачатку мая ён атрымаў загад ісці ў бок Магілёва. Але ваявода пачаў рух да месца прызначэння толькі 4 чэрвеня. Пад Магілёў А. Трубяцкі прыбыў, верагодна, напрыканцы чэрвеня [1, с. 83–84]. Там у пачатку ліпеня ён атрымаў распараджэнне падтрымаць аблогу Старога Быхава. Пад гэтай добра ўмацаванай крэпасцю ваявода знаходзіўся амаль месяц. Асаблівых поспехаў аблога не мела. Каб не губляць час, у пачатку жніўня 1655 г. А. Трубяцкому быў накіраваны новы царскі загад: пакінуць частку сваіх сіл пад Старым Быхавам для дапамогі казакам, а самому ісці ў бок Слуцка [1, с. 85].

У сярэдзіне XVII ст. Слуцк быў вялікім горадам і цэнтрам Слуцкага і Капыльскага княстваў, якія складалі значную частку ўладанняў Б. Радзівіла ў ВКЛ [5, с. 285–286]. З красавіка 1655 г. камендант горада Вільгельм Патэрсан па даручэнні князя Б. Радзівіла пачаў работы па аднаўленні гарадскіх умацаванняў. Пасля таго як у маі 1655 г. у Слуцк прыбыў сам Б. Радзівіл, работы па рамонце і будаўніцтве новых гарадскіх умацаванняў працягваліся пад яго кантролем. У гэты перыяд была пабудавана бастыённая цытадэль для абароны Новага горада, вяліся работы па аднаўленні валоў, рамантавалася старая крэпасць [5, с. 295–296; 6, с. 122–128]. Высокую абараназдольнасць Слуцка забяспечвалі не толькі гарадскія ўмацаванні, але і вялікі і добра забяспечаны гарнізон. Асноўную яго частку складалі аддзелы прафесійных жаўнераў і гарадское апалчэнне.

Вядома, што яшчэ зімой 1654 г. у горадзе быў атрад колькасцю 140 чалавек, якім кіраваў ротмістр Станіслаў Скарбэк. Увесну 1655 г. гэтыя сілы былі істотна ўмацаваны палком нямецкай пяхоты, які ў Слуцк накіраваў Б. Радзівіл пасля завяршэння няўдалай зімовай кампаніі 1654–1655 гг. Гэты атрад налічваў каля тысячы чалавек і складаўся з вопытных і добра падрыхтаваных жаўнераў [5, с. 289]. Акрамя гэтых сіл, у Слуцку падчас небяспекі збіралася гарадское апалчэнне, якое прызначалася выключна для абароны горада. Яно складалася з палкоў, якія дзяліліся на сотні. Агульная колькасць гарадскога апалчэння Слуцка, па падліках даследчыкаў, у 1655 г. дасягала 1800 чалавек [6, с. 178; 7, с. 221–222]. У лютым і чэрвені 1655 г. на сесіях гарадскога магістрата было прынята некалькі пастаноў, якія тычыліся праверкі боегатоўнасці апалчэння і забяспечанасці мяшчан зброяй. Адказнымі за праверку былі камендант і прызначаныя ім афіцэры, якія накіроўваліся ў кожны полк гарадскога апалчэння [4, s. 157].

У жніўні 1655 г. войска ваяводы А. Трубяцкога паступова рухалася ў бок Слуцка. 22 жніўня яно знаходзілася за 60 вёрст ад горада [1, с. 99]. Падчас маршу маскоўскае войска сутыкалася з актыўнасцю невялікіх атрадаў праціўніка, якія нападалі на жаўнераў у загонах або пры зборы «конских кормов». Для супрацьдзеяння гэтым нападам ваявода вылучаў так званыя «посылки», якія складаліся з пяхоты і кавалерыі. У выніку, як адзначаецца ў ваяводскай адпісцы, «в посылках твои государевы люди литовских людей побивали многих, и в языцех имали» [9, с. 436–437].

На падыходах да Слуцка маскоўскае войска сутыкнулася з атрадам, які выйшаў з горада яму насустрач. Вось як апісваецца гэта ў адпісцы ваяводы А. Трубяцкога: «А как мы пошли к Слуцку с последнего стану <…> и из Слуцка за 8 верст выходили в встречу литовские люди и немцы, шляхта, и рейтары и драгуны и, милостью Божиею <…> твои государевы люди тех литовских людей и немцев побили многих и секли до города». У выніку гэтага бою ў палон трапілі не названы па імені ротмістр і 24 чалавекі шляхты і драгунаў [1, с. 99; 9, с. 437].

У Слуцку ў гэты час працягвалася актыўная падрыхтоўка да абароны горада. Гарадскі магістрат правёў 24 жніўня чарговае пасяджэнне, на якім была

выпрацавана інструкцыя для мяшчан з правіламі паводзін падчас небяспекі. У адпаведнасці з ёй кожны мешчанін павінен быў мець дома падрыхтаваную зброю з запасам пораху і кулямі; забаранялася выходзіць на вуліцу са зброяй і збірацца вялікімі групамі; падчас абароны забаранялася страляць у ворага з вялікай адлегласці, бо патрэбна было эканоміць боезапас; не дазвалялася гучна размаўляць і крычаць, паколькі гэта перашкаджала афіцэрам аддаваць дакладныя загады. Пры ўзнікненні ў горадзе пажару тушыць яго павінны былі ў першую чаргу жанчыны, а абаронцы павінны былі заставацца на мурах. Было таксама загадана спаліць Астроўскае прадмесце [4, s. 157–159].

Першыя атрады ваяводы А. Трубяцкога з'явіліся пад Слуцкам 2 верасня 1655 г. Ваявода размясціў свае войскі ў чатырох абозах вакол горада, а ў саборы і манастыры Святой Тройцы былі абсталяваны пазіцыі артылерыі для вядзення агню па гарадскіх умацаваннях [5, с. 296].

У ноч з 2 на 3 верасня маскоўскія жаўнеры спрабавалі аказаць псіхалагічны ціск на абаронцаў Слуцка, падступаючы да гарадскіх умацаванняў. 3 верасня ў горад былі накіраваны парламенцёры з прапановай не аказваць супраціўленне. Аднак спробы схіліць мяшчан і кіраўніцтва горада да добраахвотнай здачы праваліліся. Замест гэтага з гарадскіх умацаванняў пачаўся актыўны агонь па пазіцыях маскоўскага войска. У выніку ўдалося падпаліць манастыр Святой Тройцы, дзе размяшчаліся асноўныя пазіцыі артылерыі праціўніка. У пажары былі знішчаны не толькі выгадныя пазіцыі для абстрэлу горада, але і, верагодна, уся маскоўская артылерыя. Пра гэта сведчыць тое, што ўжо 4 верасня маскоўскія войскі не вялі артылерыйскі агонь у адказ на абстрэл іх пазіцый з муроў Слуцка [5, с. 296–297; 9, с. 437].

Пасля гэтага ваявода аддаў загад спаліць частку прадмесцяў і пачаў адыход з-пад Слуцка ў бок Слоніма. Па дарозе маскоўскае войска выконвала атрыманы раней ад цара загад: «идучи дорогою, сёла и деревни, и хлеб, и сено и всякие конские кормы мы по обе стороны жгли, и людей побивали, и в полон имали…» [9, с. 437]. 9 верасня ваявода А. Трубяцкі разам з войскам знаходзіўся ў Цімкавічах, дзе даведаўся ад языкоў пра сітуацыю ў Клецку. Палонныя сведчылі, што «в том городе Клецке сидят шляхта и мещане, немалые люди». У Клецк з атрадам быў накіраваны стольнік Грыгорый Ізмайлаў. На падыходах да горада клецкі гарнізон спрабаваў прыняць бой, але, не вытрымаўшы націску маскоўскіх жаўнераў, адступіў, адразу за ім у Клецк уварваліся царскія жаўнеры. Мяшчане і шляхта пачалі ўцякаць з горада «за Пруд через мосты», спрабуючы дабрацца да Ляхавічаў. Маскоўскія жаўнеры праследавалі іх на працягу пяці вёрст і «тех Клецких литовских людей побили многих же и в языцех поимали». У выніку бою ў палон трапіла больш за 40 чалавек шляхты і мяшчан [3, с. 51; 9, с. 437].

Пасля гэтага ў Клецк увайшоў сам ваявода А. Трубяцкі з асноўнымі сіламі. Падчас маршу ён атрымаў звесткі ад жаўнераў, якія затрымаліся ў Цімкавічах, пра тоё, што з боку Слуцка прыйшлі «литовские многие люди» і атакавалі атрады Сямёна Пажарскага, якія знаходзіліся ў мястэчку. На дапамогу гэтым сілам было накіравана падмацаванне. Ваявода А. Трубяцкі падзяліў свае сілы на дзве часткі: адна пад камандаваннем ваявод Юрыя Далгарукага і Сямёна Ізмайлава накіравалася ў бок Клецка, а другая, на чале якой быў сам А. Трубяцкі, пачала вяртацца, каб дапамагчы войскам у Цімкавічах.

9 верасня пад Цімкавічамі адбыўся бой паміж атрадамі С. Пажарскага і войскам ВКЛ. Перамаглі царскія жаўнеры, якія яшчэ на працягу сямі вёрст праследавалі праціўніка і гналі яго да балота. Як адзначыў у сваёй адпісцы ваявода А. Трубяцкі, «взято на том бою в языцех ротмистров, и поручников, и всяких урядников, шляхты и немцев и рейтар 172 человека…». Палонныя прадставілі каштоўныя звесткі. Стала вядома, што ў бок Цімкавічаў атрад адправіў наваградскі ваявода Пётр Вяжэвіч, які знаходзіцца ў мястэчку Новая Мыш разам з іншымі сіламі паспалітага рушання Наваградскага ваяводства. Сілы, накіраваныя да Цімкавічаў, складаліся з 11 харугваў агульнай колькасцю крыху больш за тысячу чалавек. Асноўная іх мэта – здабыча языкоў, а не прамы ўдзел у баях супраць войскаў А. Трубяцкога [9, с. 437–438].

10 верасня 1655 г. у Новую Мыш былі накіраваны войскі Ю. Даўгарукага і С. Ізмайлава. Туды яны трапілі ўжо 11 верасня і адразу атакавалі мястэчка, але заспець там галоўныя сілы П. Вяжэвіча не змаглі, паколькі днём раней наваградскі ваявода даведаўся пра набліжэнне праціўніка і спешна адступіў у бок Берасця. На шляху да Новай Мышы маскоўскія войскі атакавалі Ляхавічы і спалілі частку гарадскіх прадмесцяў, узялі палонных, але саму фартэцыю штурмаваць не сталі. Вяртаючыся да галоўных сіл маскоўскага войска ў Клецк, Ю. Даўгарукі і С. Ізмайлаў спалілі мястэчка Стваловічы і ўзялі там палонных. Пры гэтым, як адзначаецца ў ваяводскай адпісцы, частку «лучших» палонных пакінулі, а іншых «велели посечь» [3, с. 52].

14 верасня 1655 г. ваявода А. Трубяцкі з Клецка адправіў у розных напрамках войскі для правядзення рэйдавых аперацый па тэрыторыі Наваградскага ваяводства. Галоўным кірункам удару быў абраны Слонім. Пры гэтым войскам загадвалася ісці «живыми и невоёваными месты розными дороги». Мэта паходу была сфармулявана даволі ясна: «велел им те места воевать, и людей побивать, и в полон имать, и сёла, и деревни, и хлеб, и сено и всякие конские кормы жечь, и совсем безостатку разорять».

Дадзены загад быў выкананы царскімі войскамі. На шляху да Слоніма было захоплена і знішчана мястэчка Мір. Згадваецца таксама пра знішчэнне шэрагу не названых мястэчак і вёсак. У ваколіцах Слоніма

на адлегласці 20 вёрст былі вынішчаны ўсе паселішчы. Сам Слонім і Жыровіцкі манастыр недалёка ад горада таксама падвергліся нападу і былі спалены [2, с. 140–141; 3, с. 52].

Паход царскага войска ў ваколіцы Слоніма працягваўся да 20 верасня 1655 г. Пасля гэтага маскоўцы пачалі вяртацца да Клецка. Назад яны ішлі не кранутымі баявымі дзеяннямі землямі і знішчалі іх. Да асноўных сіл ваяводы А. Трубяцкога гэтыя войскі далучыліся 22 верасня [9, с. 439].

Верагодна, 23 верасня галоўныя сілы маскоўскага войска выйшлі з Клецка, паколькі ўжо 27 верасня 1655 г. яны ў другі раз з’явіліся пад Слуцкам. На зваротным шляху войска А. Трубяцкога аб’ядналася з казакамі І. Залатарэнкі, якія прайшлі маршам з-пад Вільні і знішчылі шэраг мястэчак на Наваградчыне [3, с. 52; 5, с. 297].

Падчас знаходжання пад Слуцкам у другі раз маскоўскае войска не штурмавала ўмацаваны горад. Ваявода абмежаваўся толькі дэманстрацыяй сваіх сіл, каб аказаць ціск на абаронцаў, але гэта нічога не дало. У горад была накіравана царская грамата, у якой гаварылася, што калі гарнізон і мяшчане добраахвотна здадуцца, то ім гарантуецца захаванне ўсіх правоў і прывілеяў. На гэтую прапанову абаронцы адказалі гарматным агнём [5, с. 297; 10, с. 77–79].

Разумеючы, што знаходзіцца пад Слуцкам няма сэнсу, ваявода А. Трубяцкі прыняў рашэнне 29 верасня сыходзіць у бок Старога Быхава. Падчас адыходу адбылося некалькі сутычак. Спачатку абаронцы выбілі царскіх жаўнераў з адной з грэбляў на Случы, а пасля з горада выйшла некалькі харугваў на чале з В. Патэрсанам. За Новым горадам яны атакавалі маскоўскіх жаўнераў, спрабуючы завесці іх у засаду, але апошнія, не паддаючыся на правакацыі, арганізавана працягнулі адступленне. 30 верасня 1655 г. маскавіты спалілі свой лагер і пакінулі ваколіцы Слуцка [5, с. 297].

Наступствы паходу ваяводы А. Трубяцкога на Наваградчыну моцна адбіліся на сацыяльна-эканамічным развіцці гэтага рэгіёна ВКЛ. У 1662 г. князь Б. Радзівіл выдаў падданаму Грыгорыю Шпакоўскаму дазвол на карыстанне часткай пустых моргаў на Капыльшчыне. Прычына запусцення гэтых зямель у дакуменце ўказваецца: «за наступленнем непрыяцеля маскавіціна тыя вёскі ў нішто абернутыя і знішчаныя, таксама і горад Капыль…» [11, s. 35, 39]. Некаторыя падданыя з гэтых маёнткаў, як адзначаецца ў дакуменце, разышліся ў розныя бакі, а іншыя памерлі ад хвароб.

Найбольш дакладна можна разгледзець наступствы баявых дзеянняў восені 1655 г. на тэрыторыі Наваградскага ваяводства на прыкладзе Клецкага княства.

Клецк і яго ваколіцы сталі месцам размяшчэння галоўных сіл ваяводы А. Трубяцкога ў верасні 1655 г. Для гэтага было дзве прычыны. Па-першае, Клецк быў адзіным горадам, які маскоўскія войскі змаглі хутка захапіць. Па-другое, дадзеная мясцовасць была даволі зручнай у плане лагістыкі: ад Клецка было блізка да вялікіх і ўмацаваных морадоў – Слуцка, Нясвіжа і Ляхавічаў, адкуль магла сыходзіць небяспека для маскоўскага войска, таму можна было хутка атрымліваць звесткі пра дзеянні праціўніка. Знаходжанне паблізу ад Клецка вялікай групоўкі войскаў аўтаматычна рабіла прылеглыя землі аб’ектам для здабывання правіянту і фуражу, што разам з баявымі дзеяннямі было прычынай спусташэння краю.

У справе «Wieryfikacja ludu w księstwie Kleckim…» адлюстраваны разбурэнні і дэмаграфічныя страты станаў вясной 1656 г. Усяго ў дакуменце змяшчаюцца звесткі па 13 фальварках Клецкага княства і вёсках, якія да іх належалі [12, s. 2, 4, 5, 7–9, 11, 13, 14, 18, 19, 21]. Вынікі аналізу рэвізіі паказваюць, што ўсе фальваркі былі спалены маскоўскімі войскамі. Толькі ў фальварку Дуруцкаўшчына захавалася царква і частка двара [12, s. 20].

Падобная сітуацыя назіраецца і з вёскамі. З амаль 80 вёсак Клецкага княства не кранутымі засталіся толькі дзве, пра чатыры вёскі інфармацыя адсутнічае [12, s. 11, 15, 16, 17]. Магчыма, яны таксама захаваліся. У вёсцы Дзяніскавічы засталася шостая частка пабудоў [12, s. 3]. Як бачна, восенню 1655 г. была знішчана амаль уся тэрыторыя Клецкага княства.

Адбіліся баявыя дзеянні восені 1655 г. і на дэмаграфічных паказчыках. У рэвізіі Клецкага княства прыводзяцца дадзеныя па стратах сярод мясцовага насельніцтва. У дакуменце яно падзелена на дзве асноўныя часткі – «гаспадары» і «паспалітыя людзі» [12, s. 2–23]. Да першых, відаць, адносілі землеўладальнікаў, а да другіх – простых мясцовых жыхароў, якія не валодалі зямлёй.

Звесткі, якія прыводзяцца па гэтых дзвюх катэгорыях насельніцтва, таксама адрозніваюцца. Інфармацыя пра «гаспадароў» больш поўная. Іх падзяляюць на чатыры групы: забітыя і палонныя, памерлі пасля баявых дзеянняў, сышлі і засталіся жывымі. У сваю чаргу дадзеныя па «паспалітых людзях» прадстаўлены толькі ў групах «забітыя і палонныя», «памерлі пасля баявых дзеянняў».

Усяго, па дадзеных рэвізіі, Клецкае княства страціла 992 гаспадары, а на вясну 1656 г. засталося 1040 [12, s. 17, 23]. Страты сярод паспалітых людзей склалі 3349 чалавек [12, s. 17, 23]. Самастойны падлік па кожнай вёсцы і супастаўленне атрыманых лічбаў з дадзенымі, прыведзенымі ў рэвізіі, дэманструюць разыходжанні. Так, паводле нашых падлікаў, колькасць страт у катэгорыі «гаспадары» склала 941 чалавек, а паспалітых людзей – 2940. Пры гэтым засталося 990 гаспадароў. У адсотках можна ацаніць толькі страты ў катэгорыі «гаспадары», паколькі звестак пра колькасць паспалітых людзей, якія засталіся, няма. Па нашых падліках, зніжэнне колькасці гаспадароў на тэрыторыі Клецкага княства дасягнула 48 % у параўнанні з агульнымі лічбамі. Пры гэтым розніца

паміж нашымі падлікамі і лічбамі, прыведзенымі ў рэвізіі, складае статыстычную хібнасць і ўплыву на паказчыкі ў адсотках не аказвае.

Хутчэй за ўсё, наяўныя разыходжанні з'яўляюцца вынікам адсутнасці часткі звестак у тэксце рэвізіі, якім мы карысталіся. У прыватнасці, адсутнічае інфармацыя па пяці вёсках, якія ўнесены ў дакумент. Яшчэ па трох вёсках не прадстаўляецца магчымым часткова або цалкам прачытаць лічбы ў сувязі з дрэннай захаванасцю паперы. Відавочна, што ў час складання дакумента падобных праблем не было, а рэвізоры маглі мець дадатковыя звесткі, якія не былі цалкам адлюстраваны ў дакуменце.

Што тычыцца Клецка, то інфармацыя пра яго ў тэксце рэвізіі не поўная. Сцвярджаецца, што на вясну 1656 г. у горадзе было 118 мяшчан, якія пачалі аднаўляць дамы [12, s. 2]. Тэкст чытаецца дрэнна, таму гэтая інфармацыя патрабуе дадатковай праверкі. Гарадская забудова ў Клецку была знішчана, як і замак з касцёлам. У даследаванні В. Пазднякова прыводзяцца лічбы, якія паказваюць змены колькасці насельніцтва Клецка ў XVII ст. Так, у 1641 г. у горадзе было 82 гаспадары, а агульная колькасць насельніцтва дасягала 2240 чалавек. Пасля вайны 1654–1667 гг. гаспадароў па інвентары 1683 г. было 67, а агульная колькасць жыхароў – 1085 чалавек [8, с. 161]. Значна скарацілася колькасць рамеснікаў розных прафесій: з 43 у 1641 г. да 10 у 1683 г. [8, с. 161]. У цэлым Клецк пасля вайны 1654–1667 гг. не змог дасягнуць даваенных паказчыкаў сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Паход ваяводы А. Трубяцкога на тэрыторыю Наваградскага ваяводства завяршыўся ў канцы верасня 1655 г. З ваеннага пункту гледжання яго вынікі былі не такімі паспяховымі, як на іншых напрамках, дзе наступала царская армія. Войскам А. Трубяцкога не ўдалося захапіць ніводны вялікі ўмацаваны горад на Наваградчыне. Дзве аблогі Слуцка былі цалкам праваленыя, а такія гарады, як Нясвіж і Ляхавічы, маскоўскае войска нават не спрабавала захапіць. Сутыкнуўшыся з супрацівам, маскоўскае войска пачало знішчаць усё на сваім шляху. Быў спалены шэраг гарадоў і мястэчак, сярод іх Слонім, Мір, Стваловічы і інш. Вынішчаліся вёскі, дзе можна было здабыць прадукты харчавання і фураж. Мясцовае насельніцтва часткова было захоплена ў палон, а часткова – знішчана.

Для сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёну падзеі вайны 1654–1667 гг. былі катастрофай. На прыкладзе Клецкага княства бачна, што зніжэнне колькасці насельніцтва магло дасягаць амаль паловы. Цалкам разбуранай была эканоміка, на што паказвае заняпад гарадоў. Вярнуцца да ўзроўню даваеннага развіцця гэты рэгіён ВКЛ не змог ні ў XVII, ні ў XVIII ст.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Мальцев, А. Н.* Россия и Белоруссия в середине XVII века / А. Н. Мальцев. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1973. – 257 с.
2. *Мялешка, В. І.* Грамадзянская вайна на Беларусі (1655–1658 гг.) / В. І. Мялешка // Profesor Henryk Łowmiański – życie i dzieło: materiały z sesji naukowej poświęconej dziesiątej rocznicy śmierci Uczonego (Poznań, 7–8. X. 1994) / Instytut Historii UAM; pod red. A. Kijasa i K. Pietkiewicza. – Poznań, 1995. – С. 135–154.
3. *Сагановіч, Г. М.* Невядомая вайна 1654–1667 гг. / Г. М. Сагановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 144 с.
4. *Sawicki, M.* Dziennik oblężenia Słucka przez wojska moskiewskie w 1655 roku / M. Sawicki // Studia z dziejów Europy Środkowo-Wschodniej. – 2018. – S. 153–163.
5. *Касажэцкі, К.* Слуцк перад абліччам маскоўскай і казацкай пагрозы падчас вайны з Масквой у 1654–1667 гг. / К. Касажэцкі // Arche Пачатак: вайсковая гісторыя Вялікага Княства Літоўскага. – 2012. – № 6. – С. 285–314.
6. *Волкаў, М. А.* Замкі і фартэцыі Радзівілаў на беларускіх землях у XVI – пачатку XVIII ст. / М. А. Волкаў. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2021. – 214 с.
7. *Грицкевич, А. П.* Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв.: социально-экономическое исследование истории городов / А. П. Грицкевич. – Минск: Наука и техника, 1975. – 247 с.
8. *Пазднякоў, В. С.* Клецк X–XVIII стст.: матэрыяльная і духоўная культура беларускага феадальнага горада / В. С. Пазднякоў. – Мінск: БелНДІДАС, 2008. – 286 с.
9. Акты Московского государства, изданные Императорской Академией наук: в 3 т. – СПб.: Тип. Имп. Акад. наук, 1890–1901. – Т. 2: Разрядный Приказ: Московский стол: 1635–1659 / под ред. Н. А. Попова. – СПб., 1894. – XLV, 773 с.
10. *Заборовский, Л. В.* Великое княжество Литовское и Россия во время польского Потопа (1655–1656 гг.): документы, исследование / Л. В. Заборовский. – М.: Наука, 1994. – 189 с.
11. Archiwum Główne Akt Dawnych (AGAD). – Archiwum Warszawskie Radziwiłłów. – Dz. IV. Syg. 757. – Korespondencja Bogusława Radziwiłła. снежань 1661 – студзень 1662.
12. Archiwum Główne Akt Dawnych (AGAD). – Archiwum Warszawskie Radziwiłłów. – Dz. XVI. Справа без сігнатуры. – Wieryfikacja ludu w księstwie Kleckim wyciętego i wybranego przez Moskwę w 1656 roku.

**Анатацыя**

У артыкуле на падставе апублікаваных і архіўных крыніц, а таксама гістарыяграфічнага матэрыялу даследаваны асноўныя падзеі паходу ваяводы А. Трубяцкога праз тэрыторыю Наваградскага ваяводства ВКЛ летам – восенню 1655 г. Новыя архіўныя матэрыялы дазволілі падрабязна разгледзець эканамічныя і дэмаграфічныя наступствы паходу ваяводы А. Трубяцкога для маёнткаў князёў Радзівілаў на прыкладзе Клецкага княства.

**Abstract**

On the basis of published and archival sources, as well as historiographic material, the article examines the main events of the campaign of voivode A. Trubetskoy through the territory of the Novograd Voivodeship of the Grand Duchy of Lithuania in the summer and autumn of 1655. New archival materials made it possible to consider in detail the economic and demographic consequences of the campaign of voivode A. Trubetskoy estates of the princes Radziwills on the example of the Kletsk principality.